УДК 94(476)

# ПАВЕЛ КЛІНГЕР: ЛЁС НАВУКОЎЦА З ГРОДЗЕНСКАГА ГЕТА

***Андрэй Ціхаміраў***
*Гродзенскі дзяржаўны музей гісторыі рэлігіі, Гродна, Беларусь*
cichy77@gmail.com

Артыкул прысвечаны польскаму доктару медыцыны яўрэйскага паходжання Паўлу (Пінхасу) Клінгеру, спецыялісту ў галіне ўралогіі, сексалогіі і венералогіі. Яго галоўным навуковым творам была кніга “Vita sexualis. Праўда аб палавым жыцці”. У 1941-1943 гг. ён верагодна ўтрымліваўся ў гродзенскіх гета, ці паводле іншых звестак быў растраляны ў 1941 г. у Гродне.

***Ключавыя словы: медыцына, сексалогія, Халакост, гета, Гродна.***

# PAWEŁ KLINGER: THE FATE OF SCIENTIST FROM THE HRODNA GHETTO

***Andrei Tsikhamirau***
*Hrodna State Museum of the History of Religion, Hrodna, Belarus*

The article is dedicated to the Polish doctor of medicine of Jewish origin Paweł (Pinchas) Klinger, a specialist in the field of urology, sexology and venereology. His main scientific work was the book "Vita Sexualis. The truth about sex life". In 1941-1943, he was probably kept in the Grodno (Hrodna) ghettos or, according to other sources, was shot in 1941 in Hrodna.

***Key words: medicine, sexology, Holocaust, ghetto, Hrodna.***

Даследванне падзей Халакоста на тэрыторыі Беларусі з’яўляецца складанай і шматузроўневай праблемай, якая патрабуе значных высілкаў з боку навукоўцаў розных спецыяльнасцей, прадстаўнікоў дзяржаўных органаў і шырокага кола зацікаўленых асоб. Наяўныя крыніцы пры ўсіх сучасных магчымасцях даюць толькі фрагментарныя веды аб агульных лічбах ахвяраў, механізмах прыняцця рашэнняў, ідэалагічнай і прававой базе, на якой будавалася і ажыццяўлялася палітыка масавых забойстваў. Асобным тыпам крыніц з’яўляюцца эга-дакументы, з дапамогай якіх можна даследваць лёсы канкрэтных ахвяраў генацыду і іх мінулае. Дадзеныя крыніцы дазваляюць не толькі даведацца пра імёны і прозвішчы ахвяр, самыя простыя біяграфічныя звесткі (пол, узрост, імёны бацькоў, мужа ці жонкі, дзяцей), прафесію ці род заняткаў да вайны і падчас яе. Праз гэтыя прыватныя гісторыі можна скласці ўяўленне пра гэтых людзей не толькі як пра ахвяраў, але і тых, хто зрабіў свой унёсак у жыццё канкрэтнага населенага пункта да Другой сусветнай вайны, працаваў у рамястве, прамысловасці, сельскай гаспадарцы, быў настаўнікам, урачом, чыноўнікам, журналістам ці пісьменнікам.

Гісторыя яўрэяў, якія ўтрымліваліся ў двух гродзенскіх гета падчас Вялікай Айчыннай вайны стала прадметам больш дакладных даследванняў толькі ў канцы 1980-х – на пачатку 1990-х гг. Сярод навукоўцаў гэтую тэму даследвалі Якаў Навумавіч Мараш, Аляксандр Мікітавіч Плешавеня, Марына Яцэкаўна Калацэй (Саваняка), Ілля Якаўлевіч Мараш, Джэфры Кербер і шэраг іншых. Да пачатку Вялікай Айчыннай вайны насельніцтва Гродна складала каля 52, 5 тыс. жыхароў [3, с. 20], з іх прыкладна каля 42 % складалі яўрэі. У выніку нацысцкай палітыкі пасля ліквідацыі гродзенскіх гета № 1 і № 2 у 1942-1943 гг. было знішчана каля 25 тыс. чалавек, з іх было вывезена з Гродна ў лагеры смерці 20 577 чалавек [3, с. 22]. Сведчанні пра іх жыццё захаваліся ў нешматлікіх афіцыйных дакументах, публікацыях даваеннай прэсы, успамінах і памяці сведкаў.

Дадзены артыкул прысвечаны асобе, якая час ад часу згадваецца ў навуковай літаратуры сярод вязняў гродзенскіх гета, але з большага аўтары абмяжоўваюцца толькі ягоным прозвішчам. Унук Якава Мараша, Бені Мараш у сваім разгорнутым эсе “Геула или попытка к бегству?” пісаў пра гэтага чалавека так: “Др. Клингер из Лодзи до войны опубликовал книгу о сексуальной жизни немцев и их извращениях. Немцы нашли его в гетто 2 в

Гродно. Неоднократно избивали, но потом примирились и приходили к нему за помощью при венерических заболеваниях" [1]. Кім жа быў доктар Клінгер і ці сапраўды ён напісаў такую кнігу?

У міжваенны час апрача шматлікіх змен у палітыцы, эканоміцы, паўсядзённым жыцці і культуры, Польшча перажывала і змены ў сацыяльнай і сямейнай сферы. Звязана гэта было з прагрэсам у медыцыне, зменамі ва ўспрыняцці ролі жанчынаў, большым усведамленні ў сексуальнай сферы і зменамі маральных нормаў, якія да гэтага знаходзіліся пад моцным уплывам рэлігіі і віктарыянскай маральнасці.

Пісьменнікі і публіцысты Ірэна Кшывіцкая (1899-1994) і Тадэвуш Бой-Жэленьскі (1874-1941) актыўна прапагандавалі ідэі раўнапраўя жанчын, кантрацэпцыю, свядомае бацькоўства, планаванне сям'і. Гэты рух падтрымлівала частка вядомых навукоўцаў у галіне медыцыны, біялогіі, этыкі, філасофіі. Сярод іх быў таксама ўрач Павел (Пінхас) Клінгер з Лодзі, спецыяліст у галіне ўралогіі, венералогіі і сексалогіі, які напісаў першую на польскай мове навукова-папулярную кнігу аб сексалогіі і сексуальным жыцці чалавека "Vita sexualis. Праўда аб палавым жыцці". Упершыню яна пабачыла свет у 1930 г. у Лодзі [7], а ў 1939 г. у Варшаве выйшла трэцяе, пашыранае і перапрацаванае выданне [8]. Ода Буйвід (1857-1942) – вядомы вучоны, піянер польскай бактэрыялогіі, гігіены і прафілактыкі здароўя, адзначаў, што кніга доктара Паўла Клінгера "Vita sexualis" – гэта першае польскае выданне, якое прысвечанае сексалогіі, а таксама заклікаў увесці лекцыі па сексалогіі на медыцынскіх факультэтах тагачасных польскіх універсітэтаў, перадусім на кафедрах гігены і гінекалогіі, а таксама адмысловыя лекцыі па кантрацэпцыі на адпаведных спецыялізацыях [5, s. 4].

Тагачасная прэса пісала пра кнігу Паўла Клінгера вельмі прыхільна, напрыклад, газета "Kurier Łódzki" ("Лодзінскі кур'ер") падкрэслівала: "д-р Клінгер у сваёй працы разглядае праблему сексуальнага жыцця ў цэлым, ва ўсіх яго праявах. Кніга вельмі далёкая ад пагоні за сенсацыяй і непрызваітасцю. Тэма гэтая важная, сур'ёзная, разглядаецца ў працы сур'ёзна, усеабдымна, з навуковай дакладнасцю. Пры гэтым лёгкасць і даступнасць тлумачэнняў робіць гэтую кнігу вельмі папулярнай, даступнай для кожнага. Вычарпальны і глыбокі аналіз сужэнскага жыцця, якому аўтар прысвячае шмат увагі, з'яўляецца хіба першай спробай навуковага апісання гэтай праблемы ў сусветнай літаратуры з гэтага пункту гледжання. Праца д-ра Клінгера з'яўляецца каштоўным шляхаводнікам для кожнага чалавека. Шмат каго яна выведзе з няправільнага шляху і пакажа адпаведную дарогу. Няма сумневаў, што гэта вельмі карысная кніжка і разлічаная на шырокае кола чытачоў" [8, s. 486].

Сам аўтар ва ўводзінах таксама падкрэсліваў, што разглядаемая ім тэма – гэта важная праблема, якая ўплывае на чалавечае жыццё і патрабуе ад сучаснага чалавека дакладных ведаў: "Я стараўся, каб мая праца насіла энцыклапедычны характар і пісаў перадусім для тых, хто блукае ў лабірынтах палавога жыцця. Больш за ўсё я хацеў дапамагчы маладым мужам і жонкам, якія звычайна такія недасведчаныя і ім трэба часта доўгіх гадоў, каб дакладна даведацца пра сексуальную гармонію, якая вельмі патрэбная для сужэнскага жыцця. Перадаючы ў рукі маладым парам гэтую кнігу, я жадаў, каб яны пазбеглі горычы і прыніжэння, якія часта становяцца вынікам навукі "на ўласнай скуры". Калі гэтая праца хоць часткова прычыніцца да сужэнскага шчасця, мае намаганні не былі марнымі" [8, s. 40]. Павел Клінгер поўнасцю ў згодзе з прафесійнай этыкай медыка пісаў пра складаныя справы дакладнай мовай, без вульгарызмаў, але пры гэтым стараўся каб большасці чытачоў яго кніга была зразумелай: "Свядома прыгнятаючы сексуальныя інстынкты, мы іх выштурхоўваем у падсвядомасць і з гэтага моманту робімся іх нявольнікамі, што ў выніку дае духоўную нерашучасць і незадаволенасць у жыцці. Мэтай гэтай працы будзе асвятленне ўсіх тых фактараў, якія ствараюць наш сексуальны тып, абцяжарваюць нас усё жыццё, і часам апускаюць нас на дно ненармальных пачуццяў і бываюць прычынай нешчаслівага сужэнскага жыцця. Толькі яснае прадстаўленне гэтай справы і ўсебаковае асвятленне можа паспрыяць выкараненню ў чалавека яго атавістычных сексуальных схільнасцей, якія робяцца цёмнай плямай на ўсё жыццё. Тыя, хто шукае вострых эратычных эмоцый, будуць моцна расчараваныя, бо гэтая праца, хоць і прысвечана складаным справам, з'яўляецца псіха-біялагічным даследваннем, скіраваным для неспецыялістаў, але такіх, якія шукаюць праўду і ведаў, а не пікантнасці і парнаграфіі" [8, s. 42].

Трэцяе выданне "Vita sexualis" змяшчала ўжо 495 старонак (калі першае толькі 344 старонкі) і складалася са слоўніка асноўных тэрмінаў, слова ад аўтара, уступу і 14 раздзелаў: "Плоцевая цяга", "Сталенне і менапаўза", "Ананізм", "Менструацыя, запладненне, цяжарнасць і роды", "Сужэнства", "Пытанне прастытуцыі", "Венерычныя хваробы", "Сексуальнае ўсведамленне моладзі", "Палавая немач у мужчыны (імпатэнцыя)", "Халодная жанчына", "Бясплоднасць", "Сексуальныя вычварэнствы", "Амалоджванне людзей", "Палавое жыцце і права". Асноўнымі крыніцамі для аўтара была не толькі тагачасная навуковая літаратура на розных мовах, але і асабістыя назіранні як практыкуючага ўрача, што было канешне вельмі важным момантам, які паўплываў на папулярнасць выдання.

Кніга насіла ўніверсальны характар і не змяшчала нейкай адмысловай інфармацыі пра палавое жыццё канкрэтнага народа ці прадстаўнікоў канкрэтнага культурнага абшару. У падраздзеле "Фетышызм" (а ён у аўтара размешчаны ў раздзеле "Сексуальныя вычварэнствы") Павел Клінгер сапраўды паспрабаваў зрабіць пэўную тыпалагізацыю сексуальных фетышаў у розных народаў. Аднак варта падкрэсліць, што гэта было хутчэй асаблівасцю эпохі, калі спрабавалі будаваць розныя тыпалогіі ў розных навуках. Да фетышызму ўрач адносіўся дастаткова спакойна (пры гэтым таксама вылучаў і паталагічны фетышызм у сексуальным плане) і падкрэсліваў распаўсюджанасць гэтай з'явы: "Фетышызм вельмі моцна распаўсюджаны па ўсім зямным шары. Уласна можна смела сцвярджаць, што кожны нармальны чалавек з'яўляецца фетышыстам. І гэта праўда. Фетышызм – гэта нармальная і распаўсюджаная з'ява" [8, s. 403]. Згодна з тагачаснымі тэндэнцыямі ён паспрабаваў класіфікаваць віды фетышызму паводле нацыянальнасці: "апрача індывідуальных фетышаў існуюць і нацыянальныя, якія

ўздзейнічаюць на цэлыя людскія папуляцыі. Напрыклад, звярнем увагу на наш польскі нацыянальны фетыш – ножку. На каго ж з палякаў не ўздзейнічае малая, прыгожая жаночая ножка? Ці не глядзім мы на ножкі часцей, чым на твар? Наш першы позірк мы кіруем перадусім на ножкі, а толькі пазней на тварык. Вось полькі славяцца на ўвесь свет перадусім сваімі ножкамі, таму адбылося дапасаванне да агульнанацыянальнага фетыша. Нельга так сказаць пра немцаў, якія на ножкі амаль не звяртаюць увагі, таму што немкі ножак не маюць, а маюць ногі. А фетышам немца з'яўляюцца валасы прыгожай Грэтхэн ці Ларэлэі. Фетышам рускай інтэлігенцыі з'яўляюцца "вочы чорныя", а рускага люду – "ёмкая баба", у французаў – фігура, у італьянцаў – голас і г.д. Адным словам, няма часткі цела ці функцыі (асабліва хадзьба, гаворка, рухі і г.д.), якія б не маглі быць для канкрэтнай асобы нейкім фетышам. Апроч таго, кожны іншаземец, ці іншаземка, ці чалавек іншай расы будзе фетышам, які мае вялікую чароўнасць навізны. Экзатычнасць з'яўляецца вядомым фетышам для еўрапейцаў, таксама як і белыя для каляровых" [8, s. 404-405].

Да Другой сусветнай вайны П. Клінгер удзельнічаў у рэдагаванні аднадзёнкі "Jednodniówka Żydowskiego Klubu Gimnastyczno-Sportowego w Kaliszu" ("Аднадзёнка Яўрэйскага Гімнастычна-спартыўнага клуба ў Калішы") (1926 г.), апублікаваў таксама брашуру на ідышы "Як пазбегнуць сухотаў, рака і іншых заразных хваробаў" (Варшава, 1927), навуковы артыкул у часопісе "Nowiny Lekarskie" ("Урачэбныя навіны") "Natura frigida: дыспарэўнія і яе роля палавым жыцці жанчыны" (Познань, 1931).

Ужо ў XXI ст. у польскай навукова-папулярнай літаратуры, прысвечанай штодзённаму жыццю (і асабліва праблематыцы сексуальнасці) у міжваенны час імя П. Клінгера і яго галоўны навуковы твор згадваюцца вельмі часта [6, s. 28]. Аднак на лёс гэтага чалавека ў часы вайны на жаль не звяртаюць увагі.

Згодна са сведчаннем пляменніцы Орны Ягур, доктар медыцыны Павел Клінгер нарадзіўся ў 1894 г. на тэрыторыі Польшчы ў сям'і Дзіны і Леона (Лаіба), пражываў у Лодзі, быў жанаты на Марысі (Мані) Берковіч і быў расстраляны немцамі ў Гродне ў 1941 г. разам з іншымі супрацоўнікамі яўрэйскай бальніцы. Аляксандр Блюмштэйн, сын вядомага гродзенскага ўрача Хаіма Блюмштэйна сведчыў, што П. Клінгер утрымліваўся ў гродзенскіх гета № 1 і № 2, быў забіты зімой 1943 г. у Аўшвіцы [4]. У кнізе І.Я. Мараша апублікавана таксама два розныя сведчанні: паводле аднаго – быў расстраляны разам з іншымі ўрачамі [2, с. 66], паводле другога – здзейсніў самагубства перад ліквідацыяй гета № 1 у 1943 г. [2, с. 84]. Можна меркаваць, што Павел Клінгер трапіў у Гродна або як бежанец яшчэ восенню 1939 г., ці з'явіўся пазней, на пачатку нямецкай акупацыі горада.

Ваенныя лёсы доктара медыцыны Паўла (Пінхаса) Клінгера яшчэ патрабуюць больш дакладнага вывучэння. Аднак значэнне яго навуковай і прафесійнай дзейнасці ў галіне аховы здароўя і сацыяльнага прагрэсу ў 1920-1930-я гг. відавочныя.


1. Мараш, Б. Геула или попытка к бегству? Мыслефильм / Б. Мараш [Электронны рэсурс] / Рэжым доступу: https://berkovich-zametki.com/2007/Zametki/Nomer8/Marrash1.htm - Дата доступу: 22.02.2022.
2. Мараш, И. Я. Страницы истории гродненской еврейской общины / И. Я. Мараш. – Гродно: "ЮрСаПринт", 2017. – 189 с.
3. Савоняко, М. Я. Гродненское гетто / М. Я. Савоняко // Веснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Серыя 3. - 1992. - № 2. - С. 20-22.
4. Центральная база данных имён жертв Шоа / Яд Вашем [Электронны рэсурс] / Рэжым доступу: https://yvng.yadvashem.org/index.html?language=ru&s_id=&s_lastName=Klinger&s_firstName=Pawel&s_place=Lodz&s_dateOfBirth= - Дата доступу: 11.04.2022.
5. Bujwid, O. O wykłady seksuologii na uniwersytetach / O. Bujwid // Życie świadome. – 1936. – Czerwiec. - S. 3-5.
6. Janicki, K. Epoka hipokryzji. Seks i erotyka w przedwojennej Polsce / K. Janicki. – Kraków: Znak, 2015. – 480 s.
7. Klinger, P. Vita sexualis; prawda o zyciu płciowem człowieka / P. Klinger. – Łódź: Ksiegrania K. Neumillera, 1930. – 344 s.
8. Klinger, P. Vita sexualis. Prawda o zyciu płciowym człowieka. – Warszawa: Ksiegarnia J. Przeworskiego, 1939. – 496 s.